Весці БДПУ. Серыя 1. 2023. № 4. С. 35–37

УДК 371(476)

# НАВУКОВАЯ І ПРАКТЫЧНАЯ ЗНАЧНАСЦЬ ПЕДАГАГІЧНАЙ СПАДЧЫНЫ А. А. ГРЫМАЦЯ (ДА 85-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)

**В. П. Васілевіч,**
*старшы выкладчык кафедры педагогікі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка;*

**Л. А. Казінец,**
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры педагогікі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

Паступіў у рэдакцыю 13.10.2023.

UDC 371(476)

# SCIENTIFIC AND PRACTICAL SIGNIFICANCE OF THE PEDAGOGICAL HERITAGE A. GRYMATSYA (UNTIL 85TH BIRTHDAY)

**O. Vasilevich,**
*senior lecturer of the Department of Pedagogy, of the Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank;*

**L. Kazinets,**
*candidate of Pedagogical Sciences, associate professor of the Department of Pedagogy, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Received on 13.10.2023.

У артыкуле адлюстроўваецца творчы шлях вядомага беларускага вучонага А. А. Грымаця, аналізуецца яго дзейнасць у якасці кіраўніка структурных падраздзяленняў БДПУ. Даецца ацэнка ўклада вучонага-даследчыка ў падрыхтоўку навукова-педагагічных кадраў і распрацоўку тэорыі выхавання.

*Ключавыя словы*: вучоны-даследчык; творчы шлях; навуковы ўклад; педагагічная спадчына.

The article reflects the creative path of the famous Belarusian scientist A.A. Hrymatia, his activity as the head of the structural units of the BDPU is analyzed. The contribution of the research scientist to the training of scientific and pedagogical personnel and the development of the theory of education is evaluated.

*Keywords:* research scientist; creative path; scientific contribution; pedagogical heritage.

*Уводзіны.* Пераход чалавецтва да наасфернай цывілізацыі, высокія тэмпы інфарматызацыі, хуткае распаўсюджванне інтэгратыўнага штучнага інтэлекту абумовілі новыя магчымасці для таго, каб выявіць перакрыжаванне ідэй падрыхтоўкі настаўніка з асаблівасцямі мадэрнізацыі педагагічнай адукацыі, прааналізаваць спецыфіку сённяшніх студэнтаў падагагічнай навучальнай установы.

Ва ўмовах дынамічна развіваючагася свету жывы інтарэс вызывае педагагічная спадчына таленавітага беларускага вучонага А. А. Грымаця, 85-годдзе з дня нараджэння якога 17 кастрычніка 2023 г. адзначае педагагічная грамадскасць. Вяртанне да яго вядомых прац дапамагае пераацаніць тыя змены, якія адбываюцца ў прафесійнай падрыхтоўцы настаўніка. А. А. Грымаць з’яўляецца аўтарам больш за 220 работ, у якіх адлюстравана прагнастычнае бачанне шляхоў развіцця педагагічнай навукі і практыкі. Створаную ім навуковую школу можна лічыць творчай крыніцай развіцця такіх напрамкаў, як падрыхтоўка педагагічных кадраў у Рэспубліцы Беларусь, рэалізацыя дзейнаснага падыходу ў вывучэнні педагагічных дысцыплін, маральнае выхаванне і сацыялізацыя моладзі.

*Творчы шлях вучонага.* Даследчыцкай дзейнасцю А. А. Грымаць пачаў займацца ў гады настаўніцтва ў Швядоўскай васьмігодцы Вілейскага раёна, куды быў накіраваны ў 1960 г. пасля заканчэння аддзялення рускай і беларускай мовы філалагічнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. Цяга да аналізу самых складаных праблем педагагічнага працэсу ўзмацнілася ў гады дырэктарства ў Стражэўскай сярэдняй школе. Атрымаўшы добрую падрыхтоўку ў педагагічным інстытуце, малады дырэктар не спыняўся на дасягнутым, шукаў сябе. Ён быў упэўнены, што настаўнікі-практыкі могуць прыносіць карысць і педагагічнай навуцы.

Навуковая дзейнасць А. А. Грымаця пачынаецца ў 1967 г., калі ён становіцца аспірантам кафедры педагогікі сталічнага ўніверсітэта. Пад кіраўніцтвам віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук СССР М. К. Ганчарова малады навуковец пачынае працаваць над праблемай фарміравання маральных ідэалаў вучняў на ўроках беларускай літаратуры. У працэсе работы над дысертацыяй малады вучоны сабраў і прааналізаваў вялікі фактычны матэрыял: 280 пратаколаў урокаў, 730 вучнёўскіх сачыненняў, 1220 анкет з адказамі вучняў, 252 чытацкія фармуляры школьнікаў і г. д. З мэтай праверкі вывадаў і рэкамендацый ён сістэматычна выступаў з дакладамі перад настаўнікамі школ, на рэспубліканскіх навукова-даследчых канферэнцыях. Абарона дысертацыі праходзіла ў снежні 1970 г. Афіцыйным апанентам выступаў доктар педагагічных навук, прафесар М. І. Болдыраў. Вучоны высока ацаніў працу маладога даследчыка і пажадаў яму не спыняцца на дасягнутым. А. А. Грымаць апраўдаў надзеі свайго навуковага кіраўніка і прафесара М. І. Болдырава: праз пэўны прамежак часу сам атрымаў ганаровае прафесарскае званне, больш за 30 аспірантаў абаранілі дысертацыі пад яго кіраўніцтвам у гэтай жа навучальнай установе.

З 1975 г. А. А. Грымаць – дацэнт кафедры педагогікі Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. Важнейшым кірункам яго прафесійнай дзейнасці становіцца выкладчыцкая праца. Лекцыі вучонага лічыліся вышэйшым класам

метадычна-арганізацыйнай сістэматыкі. Студэнты называлі заняткі педагога «школай жыцця».

Пад кіраўніцтвам А. А. Грымацa былі напісаны дзясяткі навуковых прац студэнтаў на розных факультэтах навучальнай установы. Навуковы кіраўнік у кожную працу ўкладваў часцінку сваёй душы. Таму і займалі яны на конкурсах навуковых прац студэнтаў толькі прызавыя месцы. За поспехі ў падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў для народнай асветы дацэнт А. А. Грымаць у 1982 г. быў узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Талент А. А. Грымацa як кіраўніка раскрываецца на пасадзе дэкана факультэта павышэння кваліфікацыі дырэктароў школ, а затым прарэктара па вучэбнай працы МДПІ імя А. М. Горкага. У пачатку 80-х г. XX ст. навучальная ўстанова з'яўлялася адной з вядучых у Беларускай ССР.

Курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны патрабаваў інтэнсіўнага ўкаранення дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу ў адукацыйны працэс, прадугледжваў карэнную перабудову вышэйшай школы. З пачуццём асабістай адказнасці падышоў да вырашэння пастаўленай у МДПІ задачы прарэктар па вучэбнай рабоце А. А. Грымаць. Ён актыўна ўключаецца ў стварэнне арганізацыйнай структуры распрацоўкі, укаранення і выкарыстання ЭВМ, рэалізацыі адзінага плана развіцця вучэбна-лабараторнай базы інстытута.

Прарэктара А. А. Грымацa вельмі хвалявала праблема якасці падрыхтоўкі педагагічных кадраў, асабліва прафарыентацыйная работа. Менавіта таму вучоны бярэцца за распрацоўку эфектыўнай дзеючай сістэмы арыентацыі старшакласнікаў на педагагічную працу. Гэтая сістэма ўключала школу юнага педагога, групы калектыўнага вучнёўства, школьныя гурткі і інш. Трэба адзначыць, што школа юнага педагога зрабіла 17 выпускаў. Многія з тых, хто яе скончыў, сталі настаўнікамі, кіраўнікамі школ, вучонымі.

А. А Грымаць прыклаў шмат намаганняў для ажыццяўлення новага падыходу вырашэння пытанняў умацавання сувязі паміж навучальнай установай, аддзеламі народнай асветы і школамі. Гэта дзейнасць арганізоўвалася на аснове дагавораў аб садружнасці.

Дзякуючы намаганням вучонага ў навуковых даследваннях інстытута 80-х гг. стала больш увагі надавацца псіхолага-педагагічным праблемам адукацыі. А. А. Грымаць пастаянна падкрэсліваў значэнне педагогікі і псіхалогіі для вырашэння задачы ўдасканалення падрыхтоўкі будучых настаўнікаў, іх выхавання. Ён імкнуўся вырашаць пастаўленую задачу на навукова абгрунтаванай аснове.

З імем А. А. Грымацa звязаны шлях інстытута ў напрамку пераўтварэння ва ўніверсітэт. Вучоны шмат зрабіў для пераходу на новы змест навучання, узмацнення яго педагагічнай накіраванасці, актывізацыі творчай ініцыятывы выкладчыкаў і студэнтаў. Ён здолеў наладзіць цесныя кантакты і сувязі з вучонымі замежных краін. Дзе б не знаходзіўся вучоны, ён усюды прапагандаваў беларускую культуру, асвету і роднае слова.

Пастаяннае развіццё, самаўдасканаленне садзейнічалі пашырэнню кругагляду і творчай ініцыятывы А.А. Грымацa, якая на ўсю сілу праявілася ў пачатку 90-х гг., калі вучоны ўзначаліў адну з самых прэстыжных структурных адзінак універсітэта – кафедру педагогікі, якая выдзялялася сваім навуковым патэнцыялам і навуковымі напрацоўкамі. Прафесарска-выкладчыцкі калектыў кафедры пад кірауніцтвам загадчыка ўключыўся ў даследванне праблемы шматузроўневай падрыхтоўкі педагагічных кадраў. У выніку быў прадстаўлены ўніверсітэцкі варыянт падрыхтоўкі, стандарты, створана і апрабіравана сістэма падрыхтоўкі бакалаўраў і магістраў.

Адзначым і такі важны напрамак дзейнасці кафедры, як распрацоўка канцэпцыі педагагічнай практыкі студэнтаў. Многія вышэйшыя навучальныя ўстановы рэспублікі ўзялі на ўзбраенне Палажэнне аб арганізацыі і правядзенні летняй педагагічнай практыкі і яе метадычнага забеспячэння.

Кафедра аказвала дапамогу школам і навучальным установам новага тыпу. Цікавым прадстаўляецца вопыт стварэння на базе СШ № 61 г. Мінска педагагічнай гімназіі пры навучальнай установе, комплекса «МДПІ – Бярэзінская педагагічная гімназія – дзіцячы сад». Гэта дазволіла паставіць на практычную аснову рэалізацыю ідэі дапрафесійнай падрыхтоўкі настаўніка. Важным напрамкам дзейнасці кафедры ў гады кіраўніцтва А. А. Грымацa з'яўлялася падрыхтоўка навукова-педагагічных кадраў праз аспірантуру і суіскальніцтва. За разглядаемы перыяд паспяхова былі абаронены 32 кандыдацкія дысертацыі, з іх 12 – пад кіраўніцтвам А. А. Грымацa.

У прафесара А. А. Грымацa шмат паслядоўнікаў. Ён падрыхтаваў больш за 30 кандыдатаў навук. Наяўнасць такой вялікай колькасці вучняў складае сапраўднае багацце і магутную сілу любога вучонага. Сярод вучняў А. А. Грымацa – работнікі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага інстытута адукацыі, прарэктары і выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў краіны. Яны працягваюць справу свайго Настаўніка.

*Уклад вучонага ў тэорыю выхавання.* Дыяпазон навуковых інтарэсаў А. А. Грымацa вельмі шырокі. Са сваімі вучнямі ён распрацоўваў пытанні фарміравання маральна-каштоўнасных арыентацый школьнікаў і будучых настаўнікаў; сацыялізацыі моладзі ва ўмовах рынкавай эканомікі, фарміравання экалагічнай культуры падрастаючага пакалення. Вынікі, атрыманыя ў працэсе навуковага супрацоўніцтва таленавітага навукоўцы са сваімі вучнямі, адлюстраваны ў шэрагу манаграфій.

Асноўны кірунак навуковых пошукаў прафесара А. А. Грымацa – фарміраванне маральных ідэалаў школьнікаў на аснове гарманічнага спалучэння дасягненняў агульначалавечай культуры з тым, што назапасіў уласны народ. У пачатку 2000 г. была надрукавана манаграфія А. А. Грымацa «Фарміраванне маральных ідэалаў школьнікаў» [1]. Як адзначае М. А. Станчыц, выхад кнігі «стаў сапраўднай падзеяй ў педагагічным жыцці рэспублікі» [2, с. 18]. Вартасць манаграфіі заключаецца ў гісторыка-педагагічнай накіраванасці абранай праблемы, а таксама ў раскрыцці найбольш рацыянальных шляхоў выхавання маральных ідэалаў моладзі ў сучасных умовах.

Рэаліі сённяшняй сітуацыі ў вобласці маральнага выхавання дазваляюць падкрэсліць асаблівую значнасць такіх раздзелаў манаграфіі, як «Маральная дзейнасць школьнікаў» (гл.11) і «Маральная

прагностыка ў сістэме фарміравання маральных ідэалаў» (гл.10). Вучоны ўпершыню навукова абгрунтаваў сістэму фарміравання маральных уменняў, навыкаў, звычак. На яго погляд, любое ўменне школьніка, накіраванае на дасягненне і ажыццяўленне маральнага ідэала, становіцца маральным уменнем [1, с. 231].

У рабоце пастаўлена і другая мала даследаваная ў педагогіцы праблема маральнага прагназавання. Аўтар падкрэслівае, што ў аснове структуры прагнастычнай дзейнасці маральнай свядомасці школьніка ляжыць патрэба ў будучыні, якая ва ўсіх узроставых групах рэалізуецца ў жаданні быць больш дарослым. Разнавіднасці гэтай патрэбы – імкненне да самасцвярджэння, да жыццёвага самавызначэння. Патрэба ў будучыні нараджае мары, вызывае ў школьніка гаму важнейшых перажыванняў: чаканне, надзею, роздум, упэўненасць. А. А. Грымаць прапанаваў эфектыўны метад інтэнсіфікацыі развіцця прагнастычнай дзейнасці школьніка – аналіз жыццёвых сітуацый, якія патрабуюць прадбачання. Педагог лічыць, што прагназаванне маральных з'яў прадстаўляе вышэйшую форму актыўнасці маральнай свядомасці школьніка. Думкі аўтара карысны як для маладых вучоных, так і для педагогаў-практыкаў.

*Ацэнка навуковага ўклада вучонага-даследчыка.* А. А. Грымаць прайшоў вялікі працоўны шлях, адолеў многія ступені духоўнага ўзбагачэння, унёс вялікі ўклад у развіццё беларускай педагагічнай навукі, навуковага патэнцыялу Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Яго праца высока ацэнена дзяржавай. Вучонаму прысвоена званне прафесара, ён абраны правадзейным членам Міжнароднай акадэміі акмеалогіі, правадзейным членам Беларускай акадэміі адукацыі, удастоены звання Заслужаны работнік адукацыі [3]. Ільянскай школе Вілейскага раёна, якую скончыў вучоны, прысвоена імя А. А. Грымаця. У школе створаны і працуе музей, экспанаты якога адлюстроўваюць жыццёвы і творчы шлях навукоўца [4].

Багатая педагагічная спадчына таленавітага беларускага вучонага-педагога служыць трывалым падмуркам навуковых даследаванняў маладых вучоных, арыенцірам ажыццяўлення адукацыйнага працэсу для настаўнікаў-практыкаў. Яна становіцца аб'ектам даследаванняў студэнтаў, якія пішуць курсавыя і дыпломныя працы па педагогіцы. Ідэі вучонага шырока выкарыстоўваюць магістранты і аспіранты кафедры педагогікі БДПУ.

Разумны кіраўнік, смелы наватар, няўрымслівы вучоны – так можна ахарактарызаваць А. А. Грымаця. Дзейны грамадзянін, нястомны выхавацель – ён заўсёды стаяў на ідэйных пазіцыях, заснаваных на спрадвечнай народнай мудрасці і духоўнасці. На іх ён і застаўся, патрэбны людзям і Бацькаўшчыне.


### *Літаратура*

1. *Грымаць, А. А.* Фарміраванне маральных ідэалаў школьнікаў: манаграфія / А. А. Грымаць. – Мінск : Геомант, 2000. – 448 с.
2. *Станчиц, М. А.* Педагогический подвиг ученого / М. А. Станчиц // Развитие педагогической науки и практики: нравственное воспитание, народная педагогика, подготовка педагогических кадров : материалы пед. чтений, посвящ. 65-летию со дня рождения А. А. Гримотя, Минск, 27 февраля 2004 г. – Минск : Харвест, 2004. – С. 17–20.
3. *Казінец, Л. А.* А. А. Грымаць – педагог, вучоны, чалавек: манаграфія / Л. А. Казінец. – Мінск : Харвест, 2004. – 192 с.
4. *Юшко, І. А.* Школа і сёння памятае свайго вучня / І. А. Юшко // Развитие педагогической науки и практики: нравственное воспитание, народная педагогика, подготовка педагогических кадров: материалы пед. чтений, посвящ. 65-летию со дня рождения А. А. Гримотя, Минск, 27 февраля 2004 г. – Минск: Харвест, 2004. – С. 9–18.

### *References*

1. *Grymac', A. A.* Farmiravanne maral'nyh idealaŭ shkol'nikaŭ: managrafiya / A. A. Grymac'. – Minsk : Geomant, 2000. – 448 s.
2. *Stanchic, M. A.* Pedagogicheskij podvig uchenogo / M. A. Stanchic // Razvitie pedagogicheskoj nauki i praktiki: nravstvennoe vospitanie, narodnaya pedagogika, podgotovka pedagogicheskih kadrov : materialy ped. chtenij, posvyashch. 65-letiyu so dnya rozhdeniya A. A. Grimotya, Minsk, 27 fevralya 2004 g. – Minsk : Harvest, 2004. – S. 17–20.
3. *Kazinec, L. A.* A. A. Grymac' – pedagog, vuchony, chalavek: managrafiya / L. A. Kazinec. – Minsk : Harvest, 2004. – 192 s.
4. *Yushko, I. A.* Shkola i syonnya pamyatae svajgo vuchnya / I. A. Yushko // Razvitie pedagogicheskoj nauki i praktiki: nravstvennoe vospitanie, narodnaya pedagogika, podgotovka pedagogicheskih kadrov: materialy ped. chtenij, posvyashch. 65-letiyu so dnya rozhdeniya A. A. Grimotya, Minsk, 27 fevralya 2004 g. – Minsk : Harvest, 2004. – S. 9–18.